**Лупач, З.** «Бог мне даў аванс...» / З. Лупач // Вольнае Глыбокае. — 2004. — 12—18 лют. — С. 12.

## «БОГ МНЕ ДАЎ АВАНС…»

Прайшло ўжо пятнаццаць гадоў з таго часу, як 15 лютага 1989 года з Афганістана былі выведзены апошнія савецкія войскі. Цяпер гэты дзень адзначаецца як Дзень воіноў-інтэрнацыялістаў. Пятнаццаць гадоў – для гісторыі невялікі адрэзак часу. Але за гэтыя гады шмат што змянілася. Распаўся Савецкі Саюз, чаго нельга было ўявіць нават у лютым 1989 года. Беларусь стала незалежнай краінай, мы выбралі свайго прэзідэнта. Вайна ў Афганістане паступова забываецца, вырасла ўжо новае пакаленне, для якога тая вайна – далёкая гісторыя. Для нашага пакалення, тых, хто нарадзіўся ў 60-я гады ўжо мінулага стагоддзя, гэта вайна стала трагічнай рэальнасцю. Шмат хто з маладых хлопцаў вярнуўся з далёкага Афганістана ў цынкавай труне, многім выжыўшым вайна зламала лёс. Вярнуўшыся з тон вайны, яны са сваімі праблемамі аказаліся непатрэбнымі для краіны, састарэлае кіраўніцтва якой не задумваючыся паслала на смерць юнакоў, якім не было і дваццаці. Наш карэспандэнт сустрэўся з удзельнікам тых падзей Багданам Тумашам і папрасіў яго адказаць на некалькі пытанняў.

**Раскажыце коратка пра сябе.**

Біяграфія звычайная для майго пакалення. У 1984 годзе скончыў СШ № 1 у Глыбокім, паступіў вучыцца ў Магілёўскі тэхналагічны інстытут. Адтуль вясной 1985 года быў прызваны на службу ў Савецкую Армію. Служыць я патрапіў у сяржанцкую школу ў Чэлябінскай вобласці. Там нам адразу паведамілі, што нас будуць рыхтаваць для адпраўкі ў Афганістан. Сам я трапіць туды не імкнуўся, але, калі мне ўжо выпаў такі лёс, то я не ўхіляўся ад гэтага. Трэба адзначыць тут працу савецкай ідэалагічнай машыны. З нашага выпуску адзін хлопец не трапіў у Афганістан па стану здароўя. Ён са слязамі на вачах прасіў дактароў дазволіць яму там служыць.

Мне пашчасціла вярнуцца з той вайны жывым. Пасля службы закончыў інстытут, праўда давялося перавесціся на завочнае аддзяленне, жаніўся, працую на чыгуначнай станцыі ў Глыбокім старэйшым прыёмаздатчыкам.

(Дарэчы, партрэт Багдана Тумаша змешчаны на раённай Дошцы гонару. – З. Л.)

**Што найбольш запомнілася падчас службы ў Афганістане?**

Найбольш запомніўся першы дзень. Прыляцелі мы ў аэрапорт, усюды шэрыя будынкі, калючы дрот, часавыя з аўтаматамі. На акраіне аэрапорта дагараў падбіты верталёт. Ну і яркае сонца, яно там намнога вышэй, чым у нас. Калі мы выляталі з Ташкента, было пахмурна, а ў Кабуле свяціла яркае сонца. Было такое пачуцце, што трапіў у зусім іншае жыццё.

**А як Вы думаеце, трэба было ўводзіць нашы войскі ў Афганістан?**

Калі паглядзець на гэта з філасофскага пункту погляду, то так. Краіна Саветаў зрабіла шмат зла, было расстраляна шмат нявінных людзей, у тым ліку святароў, руйнаваліся храмы, у людзей знішчалася вера. І ніхто за гэта не панес адказнасці, калі не лічыць адзінкавых выпадкаў. Таму Афганістан стаў першай божай карай краіне за ўсе яе грахі. А з чыста чалавечага пункту, увод савецкіх войск нічым нельга апраўдаць. Загінула многа маладых хлопцаў, шмат людзей атрымалі фізічныя і маральныя калецтвы. Прычым гэта былі простыя людзі, сыноў вялікіх начальнікаў я там не бачыў.

Правал ваеннай аперацыі ў Афганістане быў заканамерным. На маю думку, калі б увод войск адбываўся пазней, калі ў нас у краіне была свабода веравызнання, такога б правалу магло і не быць. Савецкае кіраўніцтва ніяк не ўлічыла асаблівасці той краіны, у якой збіралася ваяваць. Там вельмі моцныя пазіцыі займае іслам, а камуністы хацелі ў адзін момант зрабіць усіх атэістамі. Таму асноўны аргумент у душманаў, калі яны вербавалі сабе прыхільнікаў, быў такі: савецкія войскі ваююць супраць ісламу, а значыць, супраць Алаха. Таму іваявалі афганцы не за якога там канкрэтнага лідэра, яны са зброяй у руках адстойвалі веру сваіх продкаў, якую ў і хацелі адабраць. Дарэчы, амерыканцы, калі ваявал супраць талібаў, улічылі гэты факт, таму і дасягнулі там поспеху.

Яшчэ адной прычынай няўдачы ў Афганістане я лічу тое, што ў краіне не было сістэмы зваротнай сувязі. Такую ролю ў грамадствс выконвае свабода слова. А так кіраўніцтва краіны не ведала, як гэта ўсё ўспрымаецца простымі людзьмі. Гэта як на фізіялагічным узроўні. Калі чалавек дакрануўся да гарачага прадмета, ён адразу прымае руку, іначай яна згарыць. Такая ж абаронча функцыя павінна быць і ў грамадства.

На мой погляд, «Аль Каіда» і «Талібан» усё роўна б узніклі, увод нашых войск толькі затрымаў на нейкі час гэты працэс, пасля вываду нашых войск гэтыя рухі пачалі набіраць сілу і прыйшлі да ўлады. Я так думаю, што калі б нашы войскі былі выведзены раней, то і нью-йоркская трагедыя адбылася б на некалькі гадоў раней, чым у 2001 годзе. І ахвяр гэтай жудаснай трагедыі магло быць больш. У 2001 годзе ўвесь цывілізаваны свет, за выключэннем некалькіх «адыёзных» краін, адназначна асудзіў тэрарызм і аб'явіў яму вайну. А калі б гэта адбылося раней, такога адзінства магло б і не быць.

**Што змяніў у Вашым жыцці Афганістан?**

Пасля вяртання на Радзіму я цалкам іначай успрымаю жыццё. Я навучыўся яго цаніць. Тое, што свеціць мірнае сонца і пад табой не ўзрываецца зямля – гэта ўжо шчасце. А ўсяго астатняга можна дасягнуць сваей працай. Галоўнае – гэта мір.

Тое, што я вярнуўся адтуль жывы, я лічу авансам, які мне даў Бог, каб я вёў правільны лад жыцця. Я лічу так, што, калі чалавек патрэбны Богу, калі на яго ён ускладае нейкія надзеі ў будучым, то Бог такога чалавека выцягне з любой сітуацыі, нават самай безнадзейнай. У нас у час службы быў такі выпадак. Адзін хлопец на блок-пасту карміў змяю. Нават у такой сітуацыі ён праявіў любоў да жывога і завёў сабе такога «сябра». Аднойчы, калі гэты салдат прынёс змяі ежу, яна абвіла яго вакол шыі і сціснула. Калі ён паспрабаваў вызваліцца, то змяя мацней стала ціснуць яму шыю. Таму хлопец больш гадзіны вымушаны быў так стаяць. Калі ж яна яго адпусціла, і ён вярнуўся на блок-пост, там усе перабіты душманамі. Вось так жывёла выратавала жыццё чалавеку.

**На Ваш погляд, наша дзяржава дастаткова надзяляе ўвагі ўдзельнікам афганскіх падзей ці ўспамінае пра іх перад якімі-небудзь палітычнымі падзеямі, калі неабходна іх падтрымка?**

Думаю, што недастаткова. Ды і льготы ў нас паступова забіраюць. Раней за электрычнасць і газ я плаціў 50%, зараз гэта ўжо адмянілі. Застаўся толькі льготны праезд на чыгунцы па Беларусі і на аўтобусе ў межах раёна. Ды і той факт, што ў мірны час воінаў-інтэрнацыяналістаў у Беларусі загінула больш, чым падчас самой вайны ў Афганістане, шмат пра што гаворыць. Некаторым было вельмі цяжка адаптавацца да мірнага жыцця. Дзяржава ж, выкарыстаўшы маладых людзей, потым кінула іх сам-насам з іх праблемамі.

Вайна – не натуральны стан для чалавека. Чалавек створаны для миру. Но трапіўшы ў тыя нечалавечыя ўмовы, душа чалавека усяк супраціўлялася гэтаму. А здароўе душы і цела звязаны паміж сабой. Калі ў чалавека хворая душа, то ў яго хварэе цела, і наадварот. Таму, я думаю, дзяржава павінна надзяліць больш увагі нам, ветэранам.

**Ну, і апошняе пытанне. У Глыбокім пастаўлены помнік воінам-інтэрнацыяналістам. Але, як на мой погляд, на такіх помніках не павінна быць зброі. А так атрымоўваецца, што мы не раскайваемся ў той вайне, помнік як бы прызывае да помсты. Як на Ваш погляд?**

На мой погляд, тое, што гэты помнік ёсць – ужо добра. Пройдзе яшчэ нейкі дзесятак гадоў, вырасце новае пакаленне, і пра гэтыя падзеі ніхто не будзе ведаць. А калі ёсць помнік, то больш шанцаў на тое, што людзі будуць пра гэта памятаць.

**З. Лупач**